**Кавалеўскі, Ц.** За «языком» / Ц. Кавалеўскі // Ленінская праўда (Віцебск). – 1981. – 9 мая. – С. 2.

## ЗА «ЯЗЫКОМ»

Камандаванне атрада Курмялёва Першай Беларускай партызанскай брыгады рыхтавалася да баявой аперацыі. Для таго, каб нанесці праціўніку вялікія страты, а самім абысціся без іх, трэба было мець дакладныя разведвальныя даныя. Камандзіру атраднай разведкі А. Малышаву было загадана прывесці «языка».

Малышаў з 19 партызанамі накіраваўся ў вёску Старое Масцішча, дзе лічылі больш верагодным, што задача будзе выканана. Дасягнуўшы вёскі, камандзір узвода стаў размяшчаць людзей і агнявыя сродкі. Адно аддзяленне з ручным кулямётам заняло пазіцыю на ўзлеску каля вёскі Старое Масцішча, другое – на невялікай вышыні, з трэцім аддзяленнем Малышаў пайшоў у вёску, размясціўся за печамі спаленых дамоў. Ад гэтага аддзялення, якое знаходзілася ў засадзе, камандзір выдзеліў у сакрэт двух байцоў і размясціў іх на краі вёскі ў бок ад населенага пункта Новае Масцішча, дзе знаходзіўся нямецкі гарнізон. Мінула каля 4 гадзін, але вораг усё не з’яўляўся. Тады Малышаў папоўз да байцоў, якія былі ў сакрэце. Толькі дабраўся да іх, як з вёскі паказаліся два фашысты. Яны ішлі ў напрамку вёскі Старое Масцішча, дзе была засада партызан. Метрах у 200 за імі рухаўся яшчэ адзін немец, а потым паказаліся яшчэ два. Падпусціўшы да сябе першых двух на адлегласць 250–300 метраў, сакрэт зняўся. Партызаны папаўзлі ў бок аддзялення, якое знаходзілася ў засадзе з супрацьлеглага боку вёскі, і заляглі за разбуранымі печамі. Гітлераўцы, бачна, нічога не падазраючы, увайшлі ў вёску, зрабілі адзін вінтовачны стрэл і пайшлі ў бок засады. Партызаны сачылі за імі, падпусцілі на 5–6 метраў. І толькі тады адзін з партызан «крыкнуў» «хендэ хох!». Немцы кінуліся ўцякаць. Малышаў скамандаваў «агонь па нагах». Затрашчалі аўтаматы. Адзін фашыст упаў. Партызаны тут жа пачалі даганяць другога. У першага партызан Лявонаў адабраў пісталет і адкінуў яго вінтоўку. Не ўдалося знікнуць і другому гітлераўцу.

Раптам прыбег сувязны і далажыў камандзіру ўзвода, што ўзлескам ідзе ў бок партызан 15 гітлераўцаў і што яны ўжо знаходзяцца непадалёку. Неўзабаве вораг адкрыў ружэйна-кулямётны агонь, партызаны адказалі тым жа. Пачалі абстрэл і тыя фашысты, якія ішлі ўслед за двума злоўленымі. Партызаны пад прыкрыццём кулямётнага агню адышлі без страт. Заданне было выканана.

Гэты эпізод быў мною запісаны 18 чэрвеня 1943 года ў лесе Астраўской дачы тагачаснага Суражскага раёна.

**Ц. Кавалеўскі,**
**былы першы сакратар Суражскага падпольнага райкома партыі**